
Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Наша слова



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 16 (453) 26 КРАСАВІКА 2000 г.

“Наша слова” віншуе ўсіх беларусаў з прайшоўшым і надыходзячым Вялікаднямі



100 гадоў назад у вёсцы Багацькаўка Мсціслаўскага раёна нарадзіўся Гаўрыіл Іванавіч Гарэцкі, беларускі геолаг, доктар геолага-мінералагічных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1930 годзе Г. І. Гарэцкі быў арыштаваны, прыгавораны да 10 гадоў пазбаўлення волі, пазбаўлены звання акадэміка. Вызвалены ў 1934 годзе. У 1937 і 1938 гадах зноў арыштаваны. Цалкам рэабілітаваны ў 1958 годзе. Адноўлены ў званні акадэміка ў 1965 годзе. Аўтар шматлікіх прац па фальклёру, эканоміцы, геаграфіі, дэмаграфіі, сельскай і лясной гаспадарцы, археалогіі (усяго больш 160, у тым ліку 8 манаграфій), адзін са стваральнікаў руска-беларускага слоўніка. Памёр у 1988 годзе.

Адродзім беларускую мову і вернем нашыя адвечныя сімвалы!

(Зварот Рады ТБМ да беларускае грамадскасці)

Дарагія суайчыннікі!

14 траўня 2000 года спаўняецца 5 гадоў з часу правядзення першага прэзідэнцкага рэферэндуму.

Рэферэндум, што пярэчыў тагачаснаму заканадаўству Беларусі, быў гвалтоўна навязаны Вярхоўнаму Савету пасля таго, як у зале паседжанняў збілі дэпутатаў ад апазіцыі, якія абвясцілі галадоўку, пратэстуючы супраць парушэння Канстытуцыі нашай дзяржавы. Фактычна гэты рэферэндум быў спланаваны імперскімі сіламі Расеі, ажыццяўляўся з іх непасрэднай дапамогі і меў на мэце анексію Беларусі.

Падчас рэферэндуму мелі месца шматлікія парушэнні, асабліва ў вясковай мясцовасці, а выява новага гербу пярэчыла свайму першапачатковаму варыянту, які быў у свой час зацверджаны Вярхоўным Саветам. І нават у такіх умовах за змену дзяржаўнай сімволікі прагаласавала менш за палову насельніцтва Беларусі (каля 49% грамадзянаў), а за наданне аднолькавых правоў беларускай і рускай мовам – 56% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

І хоць рэферэндум не меў заканадаўчай моцы, аднак, у парушэнне заканадаўства дзяржаўная сімволіка была дэманстратыўна зմененая, а беларуская мова па сутнасці страціла функцыю дзяржаўнай. На сёння ёю заканадаўства дзяржаўная сімволіка была дэманстратыўна змененая, а беларуская мова па сутнасці страціла функцыю дзяржаўнай. На сёння ёю прынцыпова не карыстаюцца кіраўнік дзяржавы з сваім бліжэйшым атачэннем і іншыя чыноўнікі па усёй Беларусі. Мэтанакіравана згортваецца прастора беларускамоўнай адукацыі ўсіх узроўняў, адсутнічаюць беларускамоўныя ВНУ, беларуская мова не толькі не выкарыстоўваецца ў справаводстве ў міністэрствах і іншых дзяржаўных установах, але і прынцыпова не ўжываецца ні ў якіх іншых стасунках у судах, пракуратуры, мытным камітэце, КДБ, Міністэрствах абароны, унутраных спраў, сувязі... Гэты сумны пералік можна цягнуць бясконца...

Аднак вынікі апошняга перапісу насельніцтва Беларусі, усё ж яскрава засведчылі, што, нягледзячы на моўную дыскрымінацыю беларусаў, амаль 8 мільёнаў жыхароў краіны прыхільна ставяцца да беларускай мовы і лічаць яе сваёй роднай, а 3 мільёны 700 тысячаў з іх штодня размаўляюць менавіта па-беларуску.

Таму ТБМ звяртаецца з заклікам да ўсіх кіраўнікоў грамадскіх арганізацыяў, прафсаюзаў, палітычных партыяў і рухаў арганізаваць 13 і 14 траўня 2000 года па ўсёй Беларусі пікеты і мітынгі з патрабаваннем надаць беларускай мове рэальны статус дзяржаўнай і вярнуць беларускаму народу яго спрадвечныя гістарычныя сімвалы.

Рэспубліканская Рада ТБМ.
16 красавіка 2000 г. Менск.

Пастанова Рады ТБМ ад 16 красавіка 2000 г.

аб выніках дзейнасці ТБМ за апошні год пасля УІ з’езду.

1.Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад старшыні ТБМ Алега Трусава Рада лічыць, што дзейнасць Сакратарыята і Рады з’яўляецца станоўчай.

2.Усім існуючым суполкам, гарадскім, раённым і абласным арганізацыям ТБМ неабходна стаць на ўлік у мясцовых органах улады да 1 чэрвеня 2000 г. і копіі пасведчанняў аб сваёй рэгістрацыі перадаць у сакратарыят ТБМ да 10 чэрвеня 2000 г.

3.Усім рэгіянальным арганізацыям ТБМ неабходна да 1 чэрвеня 2000 г. перадаць у сакратарыят спісы сваіх сяброў, а таксама сабраць сяброўскія складкі за 2000 г.

4.Арганізаваць падпіску ўсіх сяброў ТБМ на газету “Наша слова” на ІІІ квартал 2000 г.

Пастанова Рады ТБМ

Аб правядзенні масавых актаў пратэсту з нагоды 5-ых угодкаў травеньскага рэферэндуму 1995 года.

Рада ТБМ пастанаўляе:

1.Усім зарэгістраваным рэгіянальным арганізацыям ТБМ падаць заяўкі на 13 альбо 14 траўня 2000 года ў мясцовыя органы ўлады на правядзенне пікетаў з патрабаваннем надання беларускай мове рэальнага статуса мясцовыя органы ўлады на правядзенне пікетаў з патрабаваннем надання беларускай мове рэальнага статуса дзяржаўнай мовы і адкрыцці ў Менску БНУ.

2. Кіраўніцтву падаць заяўку на правядзенне ў Менску 14 траўня мітынгу пратэста супраць лінгвацыду беларускай мовы.

3. Сакратарыяту ТБМ накіраваць у СМІ Зварот Рады ТБМ да беларускай грамадскасці.

Пастанова Рады ТБМ

Аб прыняцці Канцэпцыі і Статута БНУ.

1.Рада ТБМ ухваляе праекты Статута і Канцэпцыі стварэння Беларускага нацыянальнага універсітэта, распрацаваныя па яе даручэнню ініцыятыўнай групай па стварэнні БНУ.

2. Рада ТБМ прапануе усім структурам ТБМ актыўна ўключыцца ў збор подпісаў грамадзян Беларусі за адкрыццё БНУ. Усе сабраныя подпісы перадаць у сакратарыят не пазней 20 траўня 2000 г.

3. Рада ТБМ даручае кіраўніцтву ТБМ перадаць праекты Статута і Канцэпцыі БНУ, сабраныя подпісы грамадзян Беларусі і іншых краін у Адміністрацыю Прэзідэнта і Міністэрства адукацыі Беларусі не пазней 1 чэрвеня 2000 г., а таксама прапанову адкрыць у Менску з 1 верасня 2001 г. БНУ з выкладаннем усіх прадметаў на дзяржаўнай беларускай мове з філіяламі ў гарах Ліда, Пінск і Орша.

ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МАЛІТВА ЗА БЕЛАРУСЬ

Залаты агеньчык свечачкі гарыць,
Як мне добра ў Храме з Богам гаварыць.
Свеціцца абраз мне, разбяны аклад...
Божачка, пашлі нам на Краіну лад!
Апынуўся ў горы сціплы беларус:
Атруціў Чарнобыль многа родных душ.
За Дняпром і Сожам свежы курганы.
А яшчэ хварэюць дочкі і сыны.
Божухна, цярплівы, адпусці нам грэх.
Бо заўсёды вораг забіраў з-пад стрэх...
Шчыра так малю я: боль свой на – алтар.
Бог, вярні зямельку, наш спрадвечны дар.
Госпад, дзе вулкан той зямлі апаліў,
Ты пасей гаючую, хоць адну з раслін!
Бог, прамый зямельку нам святым дажджом,
Бо пакут даволі беларусу ўжо.
Кажуць, што мы вымрам цераз дваццаць год.
Госпад, уратуй наш беларускі род!
Залаты агеньчык свечачкі гарэць,
За грахі ўсім трэба ГОСПАДА маліць!!!
АМАН.

Лілея Матусевіч,
г. Менск.

Ахвяраванні на ТБМ

1. Алесь Гуркоў (Менск)	10000 руб.
2. Алесь Камлюк (Менск)	1000 руб.
3. Святлана Камлюк (Менск)	1000 руб.
4. Уладзімір Цярохін (Менск)	12000 руб.
5. Валянцін Чарноў (Менск)	1000 руб.
6. Анатоль Хрэноўскі (Канада)	20 $
7. Сям’я Руткоўскіх (Менск)	3000 руб.
8. Камлюк Святлана, (Менск)	500 руб.
9. Камлюк Алесь, (Менск)	500 руб.
10.Чарноў Валянцін, (Менск)	500 руб.
11.Цярохін Уладзімір, (Менск)	6.000 руб.
12.ЗАТ “Сотвар” (Менск)	10.000 руб.

Таварыства Беларускай мовы імя Францішка Скарыны звяртаецца да ўсіх грамадзян Беларусі падтрымаць дзейнасць Таварыства. Сёння ТБМ праводзіць адно масавае мерапрыемства за другім. Усе яны патрабуюць вялікіх выдаткаў. Сакратарыят просіць дасылаць ахвяраванні на адрас: 220005, г. Менск, Румянцава, 13, або пералічаць на рахунак ТБМ № 3015212330014 у Гардырэкцыі Белбізнесбанка г. Менска, код 764. Кантактныя тэлефоны ў Менску 284-85-11, 213-43-52.

Дэкану факультэта гісторыі і культуры
ГрДзУ імя Янкі Купалы Крэню Івану Платонавічу
Студэнтаў 2 курса факультэта гісторыі і
культуры ГрДзУ імя Янкі Купалы

Заява

Паважаны, Іван Платонавіч!

Факультэт гісторыі і культуры Гродзенскага Дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы заўсёды быў цэнтрам захавання нацыянальных традыцыяў, культуры беларускага народа. Тут існаваў асяродак студэнтаў і выкладнікаў, для якіх гісторыя народа азначала не толькі назвы дысцыплінаў, але і нешта большае.

Адным з складнікаў фармавання самасвядомай асобы з’яўляецца нацыянальная мова. Закон Рэспублікі Беларусь “Аб мовах” дае права кожнаму навучацца на яго роднай мове. Абапіраючыся на гэты закон, мы просім Вас стварыць умовы для выкладання ўсіх навучальных дысцыплінаў па-беларуску. Тым больш, што адпавведная тэрміналогія добра распрацаваная, а калектыў выкладнікаў дастаткова падрыхтаваны для выкладання па-беларуску.

Калі просьба выкладання па-беларуску на ўсім курсу па нейкіх прычынах не можа быць задаволена, мы патрабуем стварэння на нашым курсе беларускамоўнай плыні.

Просім Вас даць нам адказ у пісьмовым выглядзе на працягу тыдня.

У выпадку, калі пытанне не будзе вырашана адпаведна, мы пакідаем за сабой права звяртацца ў вышэйшыя інстанцыі, сродкі масавай інфармацыі і праваабарончыя арганізацыі.

14.02.2000г. Подпісы.

У 2000-м годзе духоўны Чарнобыль стаў татальным

Марыя Мацюкевіч
г. Салігорск

Нельга сядзець склаўшы рукі

Даклад навукова-практычнай канферэнцыі "Закон аб мовах -- вынікі і перспектывы" 26 лютага 2000 года

Даволі часта ўзгадваецца пачатак 90-х гадоў, калі імкліва крочыла па нашай рэспубліцы хваля ўздыму на ніве нацыянальнага адраджэння. У траўні 1990 года была створана Салігорская раённа-гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы. Памятаецца, што актыўны ўдзел у яе стварэнні прымалі тагачасныя партыйныя функцыянеры. Менавіта з іх дапамогай удалося сабраць аўдыторыю пад сотні тры прыхільнікаў нацыянальнай ідэі. Гэта былі людзі розных прафесій: настаўнікі і выхавальнікі дашкольных дзіцячых установ, выкладчыкі тэхнікумаў і вучылішчаў, вучні, урачы і малодшы персанал бальніцы, журналісты, архітэктары, мастакі, рабочыя і пенсіянеры. Тады адбылося знаёмства і з паэтам Лявонам Случанінам, які двойчы прайшоў праз жудасную машыну сталінскіх ГУЛАГаў. Пасля пачалася карпатлівая штодзённая праца. Кіруючыся Законам аб мовах і Дзяржаўнай праграмай развіцця моў, актывісты Таварыства распрацавалі мерапрыемства па ўкараненні беларускай мовы ў горадзе і раёне. Гэтыя мерапрыемствы былі зацверджаны на сумесным паседжанні гарадскога і раённага выканкамаў. На беларускую мову была пераведзена інфармацыя і ў Салігорску, і ў раёне. Роднае слова загучала на аўтавакзале, пачаўся пераход на вядзенне справаводства па-беларуску. Дзевяць з дванаццаці школ горада перайшлі на навучанне на беларускай мове. Планаваўся пераход на беларускую мову асноўных перыядычных выданняў. Але... Стаўленне старшыні гарвыканкама Мікалая Юрчыка пачало мяняцца яшчэ задоўга да сумнавядомага рэферэндуму. Варта было на адным з паседжанняў гарвыканкама пакрытыкаваць яго пазіцыю, як пачаліся рэпрэсіі, а вынікі рэферэндуму дапамаглі спадару Юрчыку ў барацьбе са мной асабіста. Няма неабходнасці пералічваць усё, што было зроблена не на карысць нацыянальнаму адраджэнню. Варта толькі адзначыць, што быў зачынены шапік ТБМ, які ў такім шматнацыянальным горадзе, як Салігорск, быў проста неабходны. Дадам, што складаная эканамічная сітуацыя не дала магчымасці выдаваць адзіную беларускамоўную газету ў горадзе, якая мела прыгожую назву – "Рагнеда" і была скіравана на абуджэнне ў чытачоў нацыянальнай самасвядомасці, усведамленне ўласнай годнасці і выхаванне пачуцця гонару за сваю Радзіму, свой народ.

Пасля рэферэндуму 1996 года сітуацыя яшчэ больш пагоршылася. У горадзе засталася толькі адна беларуская школа № 12, руска-беларускімі сталі школы № 1 і № 2, гімназія. З 4869 вучняў, якія займаюцца ў гэтых школах, 2341 навучаюцца па-беларуску, што складае 13,5% ад усіх навучэнцаў школ горада. Ёсць у Салігорску і адзін беларускамоўны садок, але лёс мовы выхавання ў ім пад пагрозай, бо школа, у якую пойдуць дзеці пасля, рускамоўная.

Па словах загадчыка раённага аддзела адукацыі Валерыя Бычэні, усе вясковыя школы беларускамоўныя. Навучанне на рускай мове вядзецца ў школах гарадскіх пасёлкаў Старобін і Чырвоная Слабада. Справаводства ж як у горадзе, так і ў раёне вядзецца ў асноўным па-руску.

Мая асабістая пазіцыя такая: нельга сядзець склаўшы рукі, бо, як вядома, пад ляжачы камень вада не пацячэ. Таму ў горадзе стала традыцыяй праводзіць святы "Роднай мовы сваёй не цурайся", удзел у якіх заўсёды бяруць нашы пісьменнікі. Трэба падкрэсліць, што апошнія тры гады ідэю правядзення гэтых святаў падтрымлівае гарвыканкам і яго старшыня Ганна Лаўрукевіч. Чарговае свята, прысвечанае дзесяцігадоваму юбілею ўтварэння Салігорскай арганізацыі ТБМ і прыняцця ў рэспубліцы Закона аб мовах, будзе ладзіцца ў траўні.

Бадай самае галоўнае зараз тое, што ў Салігорску пачаў працаваць з 23 лютага дзяржаўны тэлеканал. Праўда, пакуль што няма штатнага раскладу і не зусім яшчэ вырашана пытанне фінансавання, таму ўзровень перадач жадае лепшага. Пакуль што беларуская мова на тэлеканале гучыць толькі ў навінах, але, як запэўніла старшыня гарвыканкама, канал будзе беларускамоўным. Для таго, каб ажыццявіць гэтую задачу, пасля заканчэння навучальнага года працаваць на тэлебачанні буду я. А гэта значыць, што жыхары шахцёрскага горада і навакольных вёсак праз такі магутны рычаг, як тэлебачанне, будуць далучаны да роднага слова.

Я пастаянна сачу за прэсай. Вельмі ўражваюць развагі пісьменніка Уладзіміра Дамашэвіча, сэрца якога перапоўнена болем за лёс роднай мовы. У гэтай сувязі хацелася б узгадаць эпізод з апошняга свята беларускага слова, праведзенага ў лістападзе. Перад святам з дапамогай мясцовага Палаца культуры быў арганізаваны спектакль купалаўцаў "Смак яблыка" па п'есе драматурга Анатоля Дзялендзіка, нашага земляка. Якім жа было маё здзіўленне, калі пасля ўступнага слова на сакавітай беларускай мове дырэктара Нацыянальнага тэатра Генадзя Давыдзькі Анатоль Андрэевіч выступіў ... па-руску. Наведаўшы ж пад час свята адну з салігорскіх школ на запытанне настаўніка пра будучыню беларускай мовы пісьменнік адказаў, што наша мова не мае ніякай будучыні, што трэба авалодваць замежнымі мовамі. Балюча і крыўдна. Такое сцвярджэнне пісьменніка не паддаецца ніякай логіцы. Аказваецца, манкрутаў усюды хапае, нават сярод тых, чыё прызванне, а больш дакладна, абавязак бараніць роднае слова. Хочацца нагадаць словы вядомага ўсім Францішка Багушэвіча: "Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная. Яна такая ж людская і панская, як і нямецкая, альбо французская, альбо і іншая якая...".

БЕЛАРУСКАЯ МОВА ПЕРАД ГРАНДЫЁЗНАСЦЮ ВЕРТЫКАЛІ.

Праведзеная вертыкаллю замена беларускай нацыянальнай сімволікі (герб "Пагоня", бел-чырвона-белы-сцяг) на (згодна з афіцыйным тэкстам) "прапанаваную прэзідэнтам" звычайна тлумачыцца жаданнямі Лукашэнкі А., падмацаванымі воляй незаконнага рэферэндуму. Пры такім тлумачэнні вертыкаллю свядома замоўчваецца тое, што пытанні, якія парушаюць неад'емнае права беларускага народа на суверэнную нацыянальную дзяржаўнасць, на дзяржаўныя гарантыі існавання беларускай культуры і мовы, на дзяржаўны сцяг і герб згодна з Канстытуцыяй не выносіцца на рэферэндум.

Больш таго, пытанне аб правядзенні такога незаконнага рэферэндуму было вырашана Вярхоўным Саветам 12-га склікання толькі пры паўторным галасаванні шляхам ўздзеяння на дэпутатаў "дубіналу". Гэта ўздзеенне на дэпутатаў заключалася ва ўводзе ўзброеных сілаў (часткова ў камуфляжнай форме) ў залу паседжанняў выбраннікаў народу.

Трэцім злоўжываннем для прыніжэння беларускай мовы было тое, што дзяржаўныя СМІ былі прадастаўлены толькі працаўнікам беларушчыны. Больш таго, у шэрагу выбарчых участкаў пры галасаванні выбаршчыкам тлумачылі як "правільна" належыць галасаваць. І гэта рабілася ў дзень праваядзення выбараў!

Не зважаючы на такія супрацьпраўныя дзеянні вертыкалі толькі (па афіцыйных звестках) 53,9% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў прагаласавала за прыніжэнне беларускай мовы. (Варта заўважыць, што вертыкаллю гэта лічба парой цытуецца як амаль 90%).

Вынікі рэферэндуму 1995 г., метад яго правядзення і сёння выкарыстоўваецца для таго, каб падкрэсліць перавагу самадзяржаўя вертыкалі над законнасцю і правам.

Адначасова побач са спасылкай на перавагі свавольства чынавенства над законнасцю былі зроблены і спробы тэарэтычнага абгрунтавання пераваг расейскасці над беларускасцю. "Па-беларуску, - пераконваў даверлівых Лукашэнка А. – нельга сказаць нічога грандыёзнага. Беларуская мова – бедная мова. Ва ўсім свеце толькі дзве вялікія мовы – расейская і ангельская". (Народная газета, 1 лютага 1995 г.).

Дадзеныя ЮНЕСКА: на свеце не тры, а каля шасці тысяч моваў. Кожная з іх мае свае перавагі і заганы... Прыклад. У мове эскімосаў няма словаў роўназначных прадметам: пальма, бяроза, асіна і г.д. Існуе адно слова, якое азначае "дрэва". Побач з гэтым у такой мове каля 40 словаў, якія маюць значэнне лёд або снег. Кожнае з гэтых лядова-снежных словаў мае свае ньюансы, часта нават гэтыя словы азначаюць супрацьлеглыя уласцівасці. Нешта ў значна меншых памерах мае месца і ў беларускай мове, напрыклад, крыга і марожанае азначае стан лёду.

Адначасова варта прыняць да ўвагі, што не зважаючы на прыняцце зручнай для вертыкалі мовы за шэсць гадоў безраздзельнай улады вертыкаллю не было сказана нічога грандыёзнага і хаця б вялікага. Побач з гэтым варта заўважыць, што акрамя зручнай для іх мовы чыноўнікі вертыкалі маюць і шэраг іншых палёгак, напрыклад, бюджэт прэзідэнта, комплекс "Дразды", запаведнікі і г.д.

Для сваіх грандыёзных выказванняў ні Лукашэнка А., ні іншыя вертыкальшчыкі, на жаль, не карысталіся ангельскай мовай. Няма вялікіх (грандыёзных) выказванняў нашага "бацькі" і на іншых мовах. Дык магчыма справа ў адсутнасці грандыёзных думак і меркаванняў з боку вертыкальных чыноўнікаў? Застаецца не зразумелым – ці адносіць Лукашэнка А. да невялікіх і бедных моваў кітайскую, лацінскую мову, хіндзі і г.д.

Ужо пасля правядзення рэферэндуму Лукашэнка А. даў дадатковае тлумачэнне перавагі расейскай ці ангельскай мовы над беларускай бо савецкая ўлада "агитировала за русский язык, за общность советских народов. Меня научили русскому языку" (газета "Советская Белоруссия, 16.09.1998 г.).

Падобнае сцвярджэнне Лукашэнкі А. раўназначна яго заяве аб дрэнным веданні ім беларускай мовы. Гэта дэзарыентуе яго ўласнае выказванне аб беднасці беларускай мовы, якую ён слаба ведае, але бярэцца ацэньваць яе.

Урэшце рэшт Лукашэнка А. спасылаецца на адсутнасць беларусаў на тэрыторыі Беларусі. Выступаючы 18 снежня 1998 г. у праграме расейскага тэлебачання "Подробности" Лукашэнка А. звярнуў увагу на адсутнасць беларусаў на тэрыторыі Беларусі. Па звестках, прадстаўленых асабіста яму "кампітэнтнымі" органамі, на тэрыторыі Беларусі жыве 25% рускіх, 10% - палякаў, 25% людзей ад змяшаных шлюбаў. Падсумоўваючы бачым, што справа ідзе пра 60% насельніцтва Беларусі.

Астатнія 40% згодна з меркаваннямі Лукашэнкі А. – гэта тэрыторыя з аморфным насельніцтвам. Нездарма ў бацькавай канстытуцыі (дарэчы прынятай супрацьпраўным чынам) уведзена тэрытарыяльнае прадстаўніцтва ў палатах. Дэпутатаў туды выбіраюць самі вертыкальшчыкі і прызначае сам "бацька". "Я не национал" – падкрэсліў Лукашэнка А. ("Пагоня" 12.12.1998г.).

Падсумоўваючы можам заўважыць, што ганенні на беларускую мову не маюць ні законнасці, ні грандыёзнасці, ні лагічнай падставы. Застаецца толькі - склад насельніцтва Беларусі, прыдуманы асабіста Лукашэнкам. Гэты выдуманы склад насельніцтва рашуча супярэчыць дадзеным двух апошніх перапісаў насельніцтва.

Станіслаў Урбановіч,
навуковец,
г. Менск.



Прэзідыюм канферэнцыі

Прэзентацыя кнігі С. Аляксіевіч "Чарнобыльская малітва"

А,Чарнобыль...
Чарнобыль...
Чарнобыль!
Неславутая ў свеце АЭС!...
Анатоль Грачанінікаў.

У Вільні ў Доме літаратараў адбылася прэзентацыя кнігі С.Аляксіевіч "Чарнобыльская малітва" на літоўскай мове ў перакладзе Альмы Лапінскене. На сустрэчу прыехалі пісьменіцы Валянціна Коўтун і Хрысціна Лялько.

Кніга выйшла ў выдавецтве "Alma Zittera", прэзентацыю арганізавалі "Клуб пісьменнікаў Літвы" і "Літоўская асацыяцыя беларусістаў". Гэта падзея ў культурным жыцці дзвюх краін. Асабліва ў наш час, калі кніга перастала быць самым каштоўным падарункам, на выданне кнігі трэба шукаць спонсара і аўтару і перакладчыку. У 1997 годзе ў Літве выйшла на літоўскай мове аповесць В.Быкава "Альпійская балада", у 1997 – В.Коўтун "Крыж міласэрнасці", і ў 1999 г. С. Аляксіевіч "Чарнобыльская малітва".

У сваім выступленні Валянціна Коўтун адзначыла, што літ-ра Св. Аляксеевіч – глыбока нацыянальная, беларуская, літаратура будучыні. Яе кнігі – гэта барацьба з злом, імперыяй, з таталітарнай сістэмай. Таго, чаго дасягнула пісьменніца, можна толькі здзіўляцца. Св. Аляксіевіч яшчэ і актыўны грамадскі дзеяч, адна з заснавальнікаў фонду Св. Ефрасінні Полацкай.

Альма Лапінскене, - перакладчыца, здзіўлялася мужнасці пісьменніцы, кніга цяжкая, яна кранае да глыбіні. У сваім выступленні Святлана Аляксіевіч адзначыла, што беларусы - нацыя, якая згубіла гістарычную памяць і цяпер катастрафічна губляе сябе.

Ілюстрацыя да кнігі Святланы Алексіевіч "Чарнобыльская малітва". Малюнак Маргарыты Стральчэні, беларуская школа імя Францішка Скарыны г. Вільня, настаўніца Леакадзія Мілаш.

Кніга на літоўскай мове "Gernobylio maloba" цудоўна выдадзена. Вядучы, літаратуразнаўца Пятрас Бражэнас адзначыў, што не так часта ў зале бывае столькі слухачоў, асабліва літоўскіх пісьменнікаў, журналістаў. На сустрэчы былі і вучні віленскае беларускай школы імя Фр.Скарыны, беларуская грамадскасць. Спонсар кнігі "Фонд адкрытай Літвы", прадстаўнік Біруце Курганене.

Леакадзія Мілаш, г.Вільня.

Вынікі перапісу.

Гавораць па-беларуску

Пэўным адкрыццём для многіх жыхароў Беларусі сталі вынікі перапісу насельніцтва па моўныаму пытанню. Тое, што каля васьмі мільёнаў грамадзян краіны назвалі сваёй роднай мовай беларускую – гэта яшчэ зразумела, а вось тое, што 3 мільёны 683 тысячы чалавек карыстаюцца ёй у паўсядзённым жыцці – уразіла многіх. Нават заўзятых паслядоўнікаў і аматараў роднага слова.

Не менш цікавая карціна вымалёўваецца і на Асіповіччыне. З інфармацыі, з якой азнаёміў начальнік раённага аддзела статыстыкі Уладзімір Нікіцін, вынікае, што ў нас з 59.055 жыхароў раёна ў якасці роднай назвалі беларускую мову 44.108 беларусаў. Усяго ж карэннага насельніцтва на Асіповіччыне на момант правядзення перапісу – 49.372 чалавек. Як высветлілася, дома размаўляюць па-беларуску 18.086 грамадзян раёна. Прычым, не грэбуюць беларускай мовай і 186 рускіх, якія жывуць на Асіповіччыне, 47 палякаў і 105 украінцаў. Згодна з перапісам гавораць па-беларуску ў нас і літоўцы (3), азербайджанцы (4), армяне (3), малдаване (5), казахі (4), мардоўцы (3), немцы (3), чувашы (4), грузіны (1), урдмурты (1), узбекі (2). Усяго ж на тэрыторыі раёна пражываюць побач з беларусамі 40 нацыянальнасцяў, сярод якіх і па аднаму прадстаўніку ад такіх народаў, як лакцы, бураты, кумыкі, венгры і гагаузы.

Сярод рускіх, якіх у нас 7.322, 622 чалавекі сваёй роднай мовай назвалі беларускую. А сярод беларусаў (па нацыянальнасці) 5.246 чалавек назвалі роднай рускую мову.

Паводле матэрыялаў мясцовага друку.

Выстава ў Сядзібе ТБМ

ТБМ імя Ф.Скарыны наладзіла доўгатэрміновую выставу лепшых беларускіх кніжак і часопісаў, выдадзеных апошнім дзесяцігоддзем, а таксама рарытэтных выданняў на беларускай ды польскай мовах, мастацкіх вырабаў з керамікі ды саломкі.

На гэтай жа выставе прэзэнтуюцца апошнія беларускія відэа- і аўдыёзапісы, разлічаныя як на малых, гэтак і на дарослых, а сярод новых кніг вы знойдзеце "Беларусь. Гістарычнае падарожжа для дзяцей" Кастуся Тарасава, "Крыжовы шлях" Васіля Быкава, зборнік "Аняменне. З хронікі знішчэння беларускай мовы", а таксама новыя нумары часопісаў "ARCHE", "Фрагмэнты", "Беларускі гістарычны агляд".

Дарэчы, усё пабачанае на выставе можна і прыдбаць.

Працуе выстава буднямі з 11-ае да 19-ае на Румянцава, 13 (Сядзіба ТБМ).

Нашыя шэрагі няўмольна растуць.

На сакратарыяце ТБМ, які адбыўся 2 сакавіка, была зарэгістраваная суполка ТБМ Дабрынінскай школы Ельскага р-на на Гомельшчыне (кіраўнік – Мікола Дарошчанка, у суполцы 12 чалавек), суполка студэнтаў МДПУ (4 асобы) і прыняты ў ТБМ два студэнты юрыдычнага факультэта БДУ.

Сакратарыят, што меў месца 23 сакавіка зарэгістраваў Астравецкую суполку на Гарадзеншчыне (кіраўнік – Аляксей Яскевіч, у суполцы 5 чалавек); Мала-Плотніцкую суполку ТБМ у Пінскім раёне (кіраўнік – Алена Завацкая, у суполцы 9 чалавек; суполку ТБМ пры Беларускай асацыяцыі ахвяраў палітычных рэпрэсій (кіраўнік – Зінаіда Тарасевіч, у склад суполкі ўвайшлі 9 асобаў).

Таксама ў склад ТБМ былі прынятыя тры студэнткі факультэта журналістыкі БДУ і пяць грамадзян Германіі (іх запрасілі ў ТБМ сп. Надзея Барт-Юрэвіч).

Старшыня ТБМ
Алег Трусаў

Выстава "Зямля і космас Язэпа Драздовіча"

Жыццё і творчасць Язэпа Драздовіча (1888 – 1954 г.г.) – беларускага мастака, настаўніка, археолага, пісьменніка, астранома з'яўляюцца невычэрпнай скарбніцай для выяўлення культурна-нацыянальных здабыткаў беларусаў.

Галоўная мэта выставы – раскрыццё шматграннай творчасці "беларускага Леанарда да Вінчы".

Экспазіцыя выставы складаецца з двух частак: гістарычнай і касмічнай. Гістарычная частка знаёміць з творчасцю Язэпа Драздовіча як мастака і афарміцеля першых беларускіх газет ("Рунь", "Вольны сцяг"), як даследчыка беларускай мінуўшчыны на Заслаўшчыне, Меншчыне, Дзісеншчыне, Піншчыне. Тут размешчаны такія карціны як "Гарадольская пушча" (1923г.), "Царква ў Пінкавічах" (1926г.), "Брама горада" (1920г., копія), "Гарадзец" (1919г., копія), "Музыказнаўца А.Грыневіч" (1923 г., копія), "Князь Полацкі Рагвалод" (1920 г.), "У свет па навуку" (1944 г., фотакопія). У гэтай частцы выставы мне вельмі спадабаўся дыван "Касцёл у Задарожжы" 1947 г., і дыван "Месячны краявід" 1937 г.

Касмічная частка экспазіцыі раскрывае самую невядомую для беларусаў старонку жыцця "аматара тэарэтычнай астраноміі". Я. Драздовіч выдаў у 1931 г. першую беларускую кнігу па астраноміі "Нябесныя бегі" і стварае сваю "Тэорыю паходжання планет сонечнай сістэмы". Значныя веды па астраноміі дазвалялі Язэпу Драздовічу ўяўляць і замалёўваць карціны з жыцця на Месяцы, Сатурне, Марсе.

У гэтай часцы можна ўбачыць макет планеты Сатурн (Паводле карціны Я.Драздовіча "Абсерваторыя на планеце Сатурн" 1933 г.). А таксама такія карціны як "Прырода Месяца" 1947 г. (фотакопія), "Штучнае мора на Марсе" (копія), "Сустрэча вясны на Сатурне" 1932 г., "Космас" 1943 г.

Выстава падрыхтавана Гістарычна-культурным музеем-запаведнікам "Заслаўе".

Таццяна Лёсік,
студэнтка БУК.

Сустрэчы з землякамі

Амаль штогод бывае на Віцебшчыне, - сваё, радзіме, - Генадзь Мікалаевіч Бураўкін. У сярэдзіне сакавіка Г. М. Бураўкін прыехаў да землякоў па запрашэнню абласной рады ТБМ імя Ф.Скарыны. 4 дні арганізацыі таварыства ладзілі паэтычныя сустрэчы з вядомым паэтам і грамадскім дзеячом. Генадзь Мікалаевіч быў цёпла прыняты настаўнікамі і вучнямі Лёзненскай СШ №2, Язярышчанскай і Вышадскай школ Гарадоцкага раёна, СШ № 28 г.Віцебска, Віцебскага тэхнічнага вучылішча №19.

Зацікаўленыя і грунтоўныя размовы аб стане беларускай літаратуры, рабоце сродкаў масавай інфармацыі (а, як вядома Г.М.Бураўкін зараз працуе ў журнале "Вожык"), сённяшнім сумбурным жыцці, вырашэнні моўнага пытання адбыліся у Гарадоцкім раённым доме культуры, Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М.Машэрава, Полацкай нацыянальнай гімназіі, Полацкім дзяржаўным універсітэце. Сустрэўся Генадзь Мікалаевіч і з журналістамі віцебскіх газет, мясцовага тэлебачання і радыё.

Адзінае, што азмрочвала сустрэчы – гэта немагчымасць набыць на Віцебшчыне творы Г.Бураўкіна, як і многіх вядомых беларускіх пісьменнікаў.

Іосіф Навуменка,
старшыня Віцебскай абласной рады ТБМ

"Школьныя навінкі"

У Мастах выйшла першая ў вобласці вучнёўская газета "Школьныя навіны". Яе заснавальнікам выступіла рэдакцыя газеты "Мастоўскі веснік". Выданнем газеты – падборам матэрыялаў, напісанне артыкулаў, наборам, вёрсткай – займаюцца выключна школьнікі. Рэдактарам газеты з'яўляецца дзесяцікласніца другой школы горада Масты Таня Гладухава, намеснікам рэдактара – Вольга Дзятлоўская. У сваім выданні школьнікі маюць намер распавядаць пра свае клопаты і турботы, уздымаюць хвалюючыя іх пытанні, распавядаюць пра цікавыя падзеі.

Язэп Палубятка.

ШКОЛЬНЫЯ НАВІНКІ

Французскія дыпломы беларускім студэнтам уручыў судырэктар франка-беларускага інстытута кіравання пры Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. Скарыны Марыс Шэневуа. Інстытут быў створаны на аснове дамовы аб супрацоўніцтве паміж французскім універсітэтам Клярмон-Феран і гомельскім імя Ф. Скарыны пяць гадоў назад і дзейнічае пры падтрымцы Міністэрства замежных спраў Францыі, Пасольства Францыі ў нашай краіне і Міністэрства адукацыі Беларусі. Яго мэтай з'яўляецца падрыхтоўка кіраўнічага персаналу для беларускіх і сумесных прадпрыемстваў. У гэтым навучальным годзе ў інстытуце вучыцца 112 студэнтаў.

На здымку: пасля ўручэння дыпломаў. Фота Сяргея Халадзіліна, БелТА.

Жывая кніга прыроды

Для педагогаў дашкольных устаноў. Укладальнік Ірына Марачкіна

ВЯСНА. КРАСАВІК



Красавік – сярэдзіна вясны. Стаіць пераважна яснае, бясхмарнае надвор'е. Цяплее... Знікаюць апошнія плямкі снегу, а на рэках працягваецца разводдзе.

Народная мудрасць гаворыць – красавік ваду падбірае, красачкі пушчае. Першым, сярод траў, зацвітае падбел. Яго залацістажоўтыя кветкі-кошыкі, нібы ліхтарыкі, гараць на пагорках, дзе, здараецца, яшчэ ўчора ляжаў снег. Праз тыдзень пачынаюць красаваць пралескі, кураслеп. Затым – сон-трава, лотаць і шмат іншых. Адсюль і назва месяца – "красавік".

Пульсуе па жылах дрэваў сок. Набрынялі пупышкі. Вось-вось распусцяцца першыя лісточкі на бярозе і вольсе.

Зялёным дываном пакрываюцца палі і лугі. Ажывае пасля зімовага сну вясенні лес. З ранку да позняга вечара і нават у глыбокую ноч тут стаіць птушыны гоман.

З кожным днём багацее птушынае царства. Вяртаюцца ў родныя мясціны любімыя птушкі беларусаў – белыя буслы або, як іх называюць у народзе, бацяны. Невялікімі чародкамі ляцяць качкі, клінам – гусі, вялікімі цёмнымі хмарамі – дробныя птушкі. Усе яны пасля доўгай халоднай зімы вяртаюцца на радзіму.

Сагрэтыя ласкавым сонцам вясну вітаюць матылькі, мітусяцца ў сваім "небаскробе" мурашы, зімовыя "кватэры" пакідаюць гадзюкі.

На азёрах, сажалках, балотах па вечарах чуюцца канцэрты жаб.

На нашых вачах, быццам у казцы, усё мяняецца. Жыццё працягваецца...

ПЕРШЫ ДОЖДЖ

Заскакаў вясёлы дожджык
Па двары шырокім.
Нават выскачыла траўка
Паглядзець на скокі.

Іван Муравейка.

Пушчы паважныя, зімку праспаўшыя,
Радасна песні зайгралі свае;
Лісці зашасталі, птушкі зачырыкалі,
Свішча салоўка і дзяцел клюе...

Янка Купала.

БЛАКІТ НЯБЁС

Блакіт нябёс, і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус...
Мой край завецца Беларуссю,
А сам я – хлопчык-беларус.

Сяржук Сокалаў-Воюш.

КРАСАВІК

Неба сіняе, сіняе, сіняе...
Ані межаў у ім, ані дна.
На зямлі ж прыгажуняй-княгіняю
Пазірае мне ў вочы вясна.
Лазнякі срэбным пухам пакрыліся,
Вецер пыл па-над імі мяце,
Тут – пралескі ў раўку затаіліся,
Сірацінкай фіялка цвіце,
Там – жаўцеюць вяночкі вясновыя
Красак нейкіх нязнаных яшчэ,
Там – ізноў, залатыя ліллёвыя...
З іх вясна дываны свае тчэ.

Наталля Арсеннева.

Я ВЯСНУ МАЛЮЮ

Я вясну малюю,
Фарбаў не шкадую.
Колерам зялёным –
Дрэвы і палеткі,
Колерам чырвоным –
Сонейка і кветкі.
Колерам блакітным –
Неба, ручаіну.
А якую фарбу
Воблачку пакіну?
Я вясну малюю,
Але сам бядую.
Як падаць мне песні
Жаўранкаў у высі?
Як падаць мне пахі
Траў, што разрасліся?

Як намаляваць мне.
Што спявае вецер?
Можа ў вас ёсць фарбы?
Дайце мне іх, дзеці.

Паўлюк Прануза.

ВЯСЕЛІКІ

Дзе гушкаюцца чмелікі
І поўзаюць жукі,
Растуць грыбы-вяселікі,
Вясновыя смаржкі.
Смяецца рыжы тата
І рыжанькі сынок,
Што дождыку багата
І мяккі дзірванок.
Калі ж засвеціць сонца
Над сцежкаю грыбной,
Вяселікі бясконца
Шчаслівыя вясной.

Еўдакія Лось.

КРАСАВІК

Здараліся адлігі,
І зноў кружыўся снег,
А сёння крыгі, крыгі
Распачалі свой бег.
Блакіт нябёсаў яркі,
Гракоў бадзёры крык –
Плыве на крызе шпаркай
Вясёлы Красавік.
- Куды вядзеш ты спрытна
Свой крыгу-карабель?
- У майскі край блакітны
За трыдзевяць зямель!

Алег Мінкін.

ЗЯЗЮЛЯ І КУК

У птушак быў свой цар – Кук. Лятаў ён па лесе, разганяў ваўкоў і лісіц, змей – усіх, хто нападаў на птушынае царства. Аднойчы Кук не вярнуўся ў сваё гняздо. Зажурыліся ўсе лясныя птушкі: "Хто ж нас цяпер абароніць?" Сталі раіцца. Што рабіць? Трэба ісці шукаць свайго заступніка. А хто пойдзе? У кожнага – справа: той гняздо ўе, той яечкі наседжвае, той дзяцей гадуе; адзін – стары, другі – малы... Рашылі яны адправіць зязюлю – у яе дзяцей няма і гнязда няма. Спалохалася зязюля, што трэба ісці ў вялікую дарогу, і знесла яечка.

- Куды ж я яго дзену? – гаворыць зязюля.

- Пакладзі сваё яечка ў любое гняздо! – адказалі ёй птушкі.

- А хто ж яго будзе выседжваць?

- Каму пакладзеш, той і глядзець будзе!


- Хто будзе сваіх гадаваць, той і тваё дагледзіць.

І паляцела зязюля шукаць Кука. Праляціць трохі, сядзе на галінку і кліча:

- Ку-ку!

Праляціць - зноў кліча.

З беларускай міфалогіі.



КОЦІКІ

Коцікі спалі
Ў цесных каморах.
Ды ручаінкі
Звіняць на пагорках.
Коцікі селі
На кусцік вярбовы,
Грэюць на сонцы
Жоўтыя бровы.

Данута Бічэль-Загнетава.

ЖУРАЎЛІ

У родны край
З-за акіяна,
З-за вывсокіх сініх
Гор
Жураўлі ляцяць
Клінамі,
Абуджаючы
Прастор.
Я сабраў букет
Пралесак,
Па сырой бягу
Раллі.
Я крычу
На ўвесь палетак:
- Прывітанне,
Жураўлі!
І яны мяне
Вітаюць,
Мне крычаць:
"Курлы, курлы!.."
Верыў я –
Мяне пазнаюць,
Не забудуць
Жураўлі.

Леанід Шырын.

ЛЁНЕВЫ ШПАКОЎНІ

Не на жарт стараўся Лёня,
Пілаваў і габляваў.
Адмысловыя шпакоўні
Ён для птушак змайстраваў.
Сам бялюткія дашчынкі
Скалаціў ён малатком,
Каб і кропелька-дажджынка
Не папала ўлетку ў дом.
А вясна ідзе,
Гамоняць
Звонкім пошумам гаі
На палетках і на гонях
Скрабрацца ручаі.
І аднойчы ранкам веснім,
Як вядзецца з году ў год,
Птушкі радаснаю песняй
Свой адзначылі прылёт.

Мікола Чарняўскі.

ЗЯЗЮЛЯ


Пэўна, вы вясну чулі,
Як на дрэве, на суку
Кліча на ўвесь лес зязюля:
- Ку-ку! Ку-ку!
Мне расказвала бабуля,
Хлапчуку яшчэ малому,
Што на ўсё жыццё зязюля
Адцуралася ад дому.
Родных дзетак не гадуе,
А калі знясе яечка,
Возьме ў дзюбу і цікуе –
Каму ўкінуць у гняздзечка.
Не люблю я гэтай птушкі,
Што малых не хоча гушкаць,
Ні спяваць ім калыханкі,
Ні вадзіць на пагулянкі,
І ні ў ладкі з імі пляскаць,
Ні расказваць байкі-казкі.

Васіль Вітка.

НЯЎЖО ВЯСНА?

- Вясна, вясна! – крычаць шпакі.
- Дзе ? Дзе? – пытаюць ручайкі.
- Бяжым, мо стрэнем ля ракі!..
- Няўжо вясна? Адкуль? Калі? –
Здзівіўся парастак малы,
Не ўседзяў, выскачыў з зямлі.
- Я сплю, а ўжо вясна прыйшла,
- Пупышка голас падала,
І тут жа распукнулася
І сонейку ўсміхнулася.

Іван Муравейка.



Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газэта надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 24. 04. 2000 г.
Наклад 3100 асобнікаў. Замова № 988
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 134 руб., 3 мес.- 402 руб.
Кошт у розніцу: 30 руб.